---

*Вольга Лабачэўская*

# БЕЛАРУСКІЯ АБРОЧНЫЯ ТКАНІНЫ: ДА ГІСТОРЫІ МУЗЕЕФІКАЦЫІ РЫТУАЛЬНАГА АТРЫБУТА Ў КАНЦЫ XIX – XX СТСТ.

Тканіны – нязменны атрыбут жаночых рытуальных практык абракання. Вылучаюцца тры асноўныя віды такіх рытуалаў. Да першага трэба аднесці найбольш архаічную практыку вырабу спецыяльнай абыдзённай тканіны, які складаўся з поўнага комплексу ткацкіх дзеянняў: прадзення льнянай ніткі, снавання кроснаў, ткання палатна (ручніка, наміткі) на працягу аднаго дня або ночы, і наступных рытуальных дзеянняў: абыходу з тканінай вакол вёскі, змяшчэння яе на аброчны крыж ці ў царкву, праходу пад ёй людзей, прагону праз яе свойскай жывёлы. Абыдзённы рытуал практыкаваўся на Беларусі да сярэдзіны XX ст., у тым ліку ў гады Другой сусветай вайны [1]. Другім відам абракання з'яўляецца ўжыванне ручнікоў, фартухоў, хустак у якасці ахвяры, аброку, якія жанчыны са словамі малітвы і просьбаў да Бога вешаюць на драўляныя і каменныя абракальныя крыжы. Такія тканіны – нязменны нязменны сродак жаночай рытуальнай камунікацыі са сферай боскага. Да трэцяга віду аброку адносіцца традыцыя прыносіць на Вялікдзень, Радаўніцу, напярэдадні Троіцы на надмагільныя крыжы сапраўдныя ручнікі, фартушкі, хусткі або спецыяльна падрыхтаваныя фартушкі, як дар, ахвяру продкам-дзядам. У сучаснай культуры беларусаў пры трывалай захаванасці аброчнага рытуалу і яго функцый імкліва змяняецца выгляд і спосабы вырабу сакральнага атрыбуту. Калі традыцыйна тканіны-аброкі былі саматканымі, цяпер у асноўным ужываюць крамныя тканіны, стужкі. Апошнім часам танныя і даступныя штучныя кветкі выціскаюць традыцыйныя тканіны з абрадавай практыкі.

У сувязі з гэтым надзвычай актуалізуецца задача збору дакументацыі аб практыцы абракання і абрадавым тканінам: іх фотафіксацыя, запісы наратываў носьбітаў традыцыі і на падставе гэтага – тэарэтычнае вывучэнне і інтэрпрэтацыя аброчнай абрадавай практыкі ў беларусаў. Вядома, што тэма жаночага абракання пры дапамозе тканін цікавіла даследчыкаў беларускай культуры ў канцы XIX – пачатку XX ст. Аднак, гэтыя матэрыялы маладаступныя сучасным даследчыкам. У сувязі з гэтым ў артыкуле ставіцца мэта прааналізаваць і ўвесці ў навуковы абарот калекцый тканін рытуальнага прызначэння канца XIX–XX ст. з тэрыторыі Беларусі, якія знаходзяцца ў зборах айчынных і замежных музеяў.

Найбольш ранняя калекцыя аброчных фартушкоў з крыжоў паходзіць з Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні і датуецца 1893 годам. Яна захоўваецца ў Этнаграфічным музеі імя Севярына Удзелі ў Кракаве. Яе сабраў Станіслаў Чэрха – польскі мастак, этнограф-аматар, член антрапалагічна-археалагічнай камісіі Акадэміі Умеентносці у Кракаве [4, с. 36–37]. Да 1918 года калекцыя знаходзілася ў кабінеце археалогіі і гісторыі мастацтва Ягелонскага універсітэта. У навуковы абарот гэты цікавы збор быў ўведзены з поўным апісаннем і фотафіксацыяй літоўскай даследчыца Мігле Лебеднікайце [3, с. 425–439].

Калекцыі складаецца з 18 фартушкоў. Усе яны былі зняты з крыжоў, аб чым сведчыць музейная дакументацыя. Фартушкі часткова пашкоджаныя, маюць чорныя плямы і дзіркі, што характэрна для тканін, якія доўгі час знаходзіліся на адкрытым паветры пад уздзеяннем вільгаці, паветра і сонца. Разам з тым, сярод іх ёсць і тканіны ў добрым стане захаванасці. На падставе досведу нашай палявой практыкі можна меркаваць, што тканіны былі зняты з некалькіх крыжоў – магчыма двух ці трох, на якіх яны віселі адзін на адным. Менавіта так вешаюць аброчныя тканіны ў наш час. Такім чынам пашкоджанню падвяргаюцца пераважна тканіны, якія знаходзяцца пад сподам, бо пры намаканні яны больш павольна высыхаюць і з гэтай прычыны на іх утвараецца цвіль.

Усе фартушкі выкананы з саматканага льнянога палатна. Яны невялікіх памераў і нагадваюць дзіцячыя фартушкі – ад 20 да 30 і 34 – 42 см у вышыню, ад 35 да 43 – 51 см у шырыню. Па нізе ўсе фартушкі аздоблены тканай паласой нескладанага геаметрычнага арнаменту. Толькі два з іх дэкарыраваныя больш шырокім (13 і 18 см) геаметрычным бардзюрам бранага ткацтва і мярэжкай. Некалькі фартушкоў завершаны плеценымі з чырвоных нітак махрамі. Гэта ўказвае на тое, што аброчныя фартушкі былі зроблены з ужываных намітак – ручніковых галаўных убораў з аздобамі па канцах, якія замужнія жанчыны насілі на галаве. У канцы XIX ст. такі галаўны ўбор на Магілёўшчыне ўжо амаль выйшаў з ужытку. Два фартушкі з нашытымі палоскамі чырвонага каленкору, магчыма, былі зроблены з канцоў ручнікоў-набожнікаў. Такім чынам можна меркаваць, што гэтыя музейныя прадметы прадстаўляюць сабой узоры тканін, якія былі выраблены ў пачатку – першай палове XIX ст.. Таму яны з'яўляюцца надзвычай каштоўнай крыніцай для вывучэння асаблівасцей жаночых галаўных убораў і арнаментыкі ручнікоў на Рагачоўшчыне. Аб другасным ужыванні тканін сведчыць тое, што амаль усе фартушкі ўверсе па краю на хуткую руку сабраныя ў зборку суровай льняной ніткай. Пры дапамозе гэтай ніткі яны мацаваліся на драўляным крыжы. Ёсць фартушкі з вышыванымі сцяблістым шытвом выявамі 3 ці 5 крыжыкаў, крывулькі ці прамой сцежачкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1928 годзе знакаміты польскі этнограф Казімір Машыньскі, які сярод іншага цікавіўся традыцыяй тэкстыльных аброкаў на Палессі, перадаў у Этнаграфічны музей Кракава аброчны фартушок з крыжа (11 х 25 см), зроблены з разарванага ўздоўж на дзве паловы канца ручніка з чырвонымі палоскамі з простым зубчастым і шашачным арнаментам [3, с. 425].

Адзін з найбольш ранніх збораў аброчных тканін з тэрыторыі Беларусі знаходзіцца ў Расійскім этнаграфічным музеі у Санкт-Пецярбурзе. У 1906 г. у музей ад карэспандэнта музея В.В. Костка паступіў ільняны фартушок з аброчнага крыжа ў Ігуменскім павеце (кал. 327-24). Фартушок мае памеры 49 х 70 см, акуратна падшыты ўнізе, аздоблены палоскай чырвонага каленкору ў дробны белы гарэшак, зверху абточаны паяском. Па акуратнасці выканання гэты фартушок можна прыняць за ўзор дзіцячага адзення, калі бы не нашытыя на ім швом «касічка» пяць раўнаканцовых крыжыкаў, што сведчаць аб рытуальным прызначэнні фартушка.

У 1908 годзе этнограф А.А.Рагозіна папоўніла калекцыю сакральных тканін Этнаграфічнага музея дзевяццю фартушкамі (кал. 1482 – 73-80) і двума ручнікамі (кал. 1482 – 82-83) з прыдарожнага крыжа ў в. Паражыр Ігуменскага павета Мінскай губерні. Трэба адзначыць, што частка фартушкоў калекцыі выраблена не з саматканай тканіны, а з пакупнога паркалю. Фартушкі выразаны па краю зубамі і аздоблены крыжам, нашытымі чырвонымі ніткамі тамбурным шытвом, або выкананымі з чырвонай тканіны ў тэхніцы аплікацыі. На адным з фартушкоў пад крыжам змешчаны ініцыялы «О.А.» (кал. 1482 – 79).

Тэкстыльныя аброчныя атрыбуты знаходзіліся ў сферы даследчай ўвагі вядомага беларускага этнографа А.К.Сержпутоўскага. У 1907 годзе ён прывёз у Этнаграфічны музей з сяла Церабежоў Пінскага павета Мінскай губерні (Столінскі раён Брэсцкай вобласці) унікальны абрадавы прадмет – «абыдзённік» (кал. 1225 – 152), які быў вытканы на працягу аднаго дня 28 жанчынамі, каб спыніць хваробу ў сяле, і змешчаны на пераносны абраз у мясцовай царкве. Гэта адзіны вядомы нам музейны экспанат рытуальнай абыдзённай тканіны.




*Малюнак 1* — Элементы ручнікоў.

У Расійскім этнаграфічным музеі знаходзіцца яшчэ пяць фартушкоў (кал. 4164 – 35-39) з надмагільных крыжоў у в. Жываглодавічы Вызнянскай воласці Слуцкага павета (цяпер в. Першамайск Салігорскага раёна Мінскай вобласці), якія разам з вянкамі, што былі на іх, прывезены А.К.Сержпутоўскім з экспедыцыі 1910 года. Відавочна, што фартушкі былі зняты непасрэдна з крыжа, бо яны маюць пашкоджанні ад цвікоў, іржы, чорныя плямы цвілі на тканіне. На двух фартушках нашыты па тры крыжыкі з чырвонай тканіны. Адзін з іх аздабляюць тры шасціканцовыя праваслаўныя крыжы, намаляваныя чорным алоўкам, а па краі тканіны выразаны зубы і дзірачкі (кал. 4164 – 38). Такі фартушок мае «імгненны» характар, зроблены на хуткую руку непасрэдна перад выканання аброчнага рытуалу.

Цікавая інфармацыя змешчана ў музейным вопісу фартушка з в. Кадава Талпечанскай воласці Магілёўскай губерні: «Фартучек» (фартушок). Падобны фартушок вешаўся на крыжах у яравым полі сялянкамі, у якіх былі дзеці, і шыўся з дзіцячых пялюшак» (кал. 13038). Фартушок мае памер 37 х 50 см. На вялікі жаль, значная частка прадметаў калекцыі, з якой паходзіць гэты прадмет не мае пашпартных дадзеных. Месца паходжання і імя яе збіральніка невядома. Фартушкі трапілі ў музей у 1948 годзе пры перадачы ў Ленінград экспанатаў былога Музея народаў СССР у Маскве.

Такім чынам, калекцыя тканін рытуальнага прызначэння з Беларусі ў Расійскім этнаграфічным музеі ў Санкт-Пецярбургу, якая была сабраная рознымі даследчыкамі ў пачатку ХХ ст., з’яўляецца досыць прадстаўнічай па колькасці прадметаў, каштоўнай і важнай крыніцай для вывучэння практыкі жаночага абракання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1920–1930-я гг. абрадавыя тэкстыльныя прадметы збіралі таксама айчынныя музеі. У Беларускі дзяржаўны музей у 1923 годзе з экспедыцыі ў Слуцкі павет з вёсак Сяргеява, Хоцячы, Шацк былі прывезены фартушкі і ручнікі-«ахвяры» з надмагільных і царкоўных крыжоў – усяго 185 адзінак. Аб гэтым сведчыць інвентарная кніга Беларускага дзяржаўнага сацыяльна-гістарычнага музея ў Мінску[1] за 1934 год, дзе гэтыя экспанаты запісаны пад № 5247–5432. Здзіўляе вялікая колькасць прадметаў, якія былі сабраны за адзін раз. Магчыма яны былі прывезены сумеснай экспедыцыяй музея і Інстытута беларускай культуры, якая збірала экспанаты для арганізацыі экспазіцыі народнага побыту Беларусі на Усесаюзнай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўцы ў Маскве ў 1923 год. У экспедыцыях тады прымалі ўдзел супрацоўнікі Інбелкульта Дз.Жылуновіч, А.Шлюбскі, М.Мялешка, мастак М.Філіповіч [2, с. 85].

На вялікі жаль, выявіць гэтыя экспанаты ў зборы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь не ўдалося. У яго калекцыі разам з тым ёсць іншыя тэкстыльныя прадметы рытуальнага прызначэння пачатку ХХ ст. з в. Дзмітрыевічы Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці – фартушкі з распяццяў на крыжах, датаваныя [3, с. 440–441]. Яны зроблены з васьмінітовай льняной ручніковай тканіны тыпу «дымка». Два з іх аздоблены чырвонымі палоскамі (кп 33714 т 814, кп 33715 т 815), трэці мае па нізе нескладаную вышыўку крыжыкам (кп 33716 т 816).

Агляд музейных збораў сведчыць пра тое, што тканіны рытуальнага прызначэння ў канцы ХІХ – пачатку ХХ ст. прыцягнулі ўвагу беларускіх, расійскіх і польскіх даследчыкаў культуры Беларусі. У выніку ў музеях прадстаўлены тры тыпу тканін: абыдзённыя, аброчныя і надмагільныя. Трэба адзначыць, што аброчныя фартушкі і ручнікі, якія былі знятыя з прыдарожных і надмагільных крыжоў, маюць невялікія памеры, паўтараюць форму сапраўдных жаночых фартухоў, зроблены з ужываных прадметаў жаночага адзення (наміткі, фартухі) ці ручнікоў, а ў адным выпадку – з дзіцячых пялюшак, пераважна з саматканай, але таксама і з крамнай тканіны. Адметнай рысай усіх гэтых прадметаў з’яўляецца тое, што пераважна яны зроблены на хуткую руку.

Каштоўнасць музейных прадметаў і іх этнаграфічных апісанняў заключана ў крыніцазнаўчай важнасці гэтых матэрыялаў для даследавання рытуальнай практыкі жаночага абракання, якую па нашым перакананні трэба лічыць адной з грунтоўных складнікаў традыцыйнай культуры беларусаў. Намі на працягу больш трох дзесяцігоддзяў праводзіцца фотафіксацыя аброчных і надмагільных крыжоў, запісваюцца наратывы аб аброчнай практыцы ад носьбітаў традыцыі – вясковых жанчын. Параўнанне сучаснай дакументацыі аброчнага рытуалу з музейнымі артэфактамі дазваляе зразумець дынаміку механізму змен ў семантыцы і формах традыцыйнай культуры.

Матэрыялы экспедыцый, у тым ліку апошніх гадоў, сведчаць пра трывалую захаванасць на Беларусі аброчнага рытуалу, яго традыцыйна жаночы характар, нязменнасць ужывання менавіта тэкстыльных аброкаў у выглядзе спецыяльна падрыхтаваных на хуткую руку фартушкоў. Разам з тым, відавочна пашырэнне відавой разнастайнасці аброкаў. Сёння ў абракальным рытуале ўжываюцца разнастайныя тэкстыльныя прадметы: хусткі, ручнікі ўласнага вырабу і прамысловай вытворчасці (нават махровыя ручнікі), адрэзы крамнай тканіны, у тым ліку парц’ернай і цюлю, капронавыя стужкі, штучныя кветкі яскравых колераў. Аброчны рытуал, які дайшоў да нашага часу, патрабуе свайго грунтоўнага даследавання.

**Спіс літаратуры:**

1. Лобачевская, О. Ритуал в повседневности войны об архаической ритуальной практике в годы Второй мировой войны в Беларуси / О. Лобачевская // Homo historicus 2009: Гадавік антрапалагічнай гісторыі / пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Вільня : ЕГУ, 2010. – С. 43 – 53.
2. Лабачэўская, В.А. Беларускія народныя тканіны і арнамент: да гісторыяграфіі вывучэння, музеефікацыі і выставачнай рэпрэзентацыі ў 1920-я гады / В.А. Лабачэўская // Весці Нац. Акад. навук Беларусі. Сер.гуманіт. навук. – 2012. – № 2. – С. 84 – 90.
3. Lebednykaite, M. Šventadienės prijuostės lietuvos kultūroje. XIX a. – XX a. pirmoji pusė : doktaro disertacja / M. Lebednykaite. – Vilnius : Vilniaus Dailės Akademia, 2013. – S. 425 – 442.
4. Śnieżeńska-Stolot, E. Stanisław Cercha (1867–1919). Etnografowie i ludoznawcy polsce: sylwetki, szkice biodraficzne / E. Śnieżeńska-Stolot. –Wrocław –Kraków, 2002. – T. I. – S. 26 – 37.

***Юрий Бундин***

## ПРАЗДНИК И НАЦИОНАЛЬНАЯ ИДЕНТИЧНОСТЬ

Реалии глобализирующегося мира диктуют потребность дальнейшего осмысления проблем национальной идентичности и выработки системы надежных мер по ее формированию. Национальная идентичность, прежде всего – важнейшее средство легитимации политической власти и создания необходимых

[1] Зборы гэтага музея знаходзяцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Там жа знаходзіцца згаданая інвентарная кніга.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ